# АРХІТЭКТУРА БЕЛАРУСКАГА ПАГРАНІЧЧА



Армэн Сардараў

Адно з найважнейшых пытанняў тэорыі і гісторыі архітэктуры заключаецца ў тым, наколькі дыяпазон ужывання тых ці іншых архітэктурных стыляў і напрамкаў супадае з нацыянальнымі межамі дзяржаў ці з межамі рассялення розных этнасаў. Наступнае, ужо вечнае – пытанне аб нацыянальным і інтэрнацыянальным у архітэктуры.

Геаграфічная, этнічная і палітычная арганізацыя ў розных народаў, безумоўна, з часам змяняецца. Этнасы могуць міграваць, уваходзіць у асіміляваныя стасункі з іншымі народамі ці зусім знікаць з гістарычнага небасхілу. Гэта яшчэ ў большай ступені датычыцць тэрытарыяльнай арганізацыі дзяржаў – імперыі распадаюцца, дзяржавы знікаюць або зноў адраджаюцца ў тых ці іншых сацыяльна-палітычных канструкцыях.

Тым больш важна зазірнуць у гісторыю нацыянальных культур, разгледзець іх змены ў прасторы і часе. Прычым неабходна аддзяліць этнічную культурную гісторыю ад сацыяльна-палітычнай, бо гэтыя імператывы таксама маюць свае асаблівасці і могуць не супадаць цалкам ці ў дэталях.

Беларуская гісторыя дае нам яскравыя і красамоўныя прыклады гэтага яшчэ і таму, што станаўленне беларускай народнасці праходзіла на розных землях і нават зараз яно не супадае з дзяржаўнымі межамі краіны. Беларуская гісторыя і беларуская народнасць у розныя часы былі звязаны з гісторыяй усходняга славянства, балтаў, яцвягаў, Русі, Расіі, Польшчы, Літвы, Украіны. Культурныя межы беларускай зямлі таксама ахоплівалі і зараз ахопліваюць вялікія арэалы.

Цікава да ўсяго гэтага прасачыць гісторыю крывічоў – продкаў сучасных беларусаў, іх гістарычны рух, эвалюцыю і рэшткі гэтых працэсаў у сучаснай дзейнасці.




1. Фрагмент карты рассялення ўсходніх славян. Склад. Л. Нідэрле

Любар Нідэрле, вядомы чэшскі славіст, у сваіх даследваннях [1] лакалізуе тэрыторыю пражывання плямёнаў крывічоў на абшарах паўднёва-ўсходняй Еўропы ад Полацка да Ноўгарада, Пскова і Суздаля (мал. 1). Трэба адзначыць, што з'яўленне на гістарычнай арэне крывічоў навукова не высветлена да канца. Існуюць гіпотэзы іх аўтахтоннасці, прыходу разам з іншымі славянскімі плямёнамі ці асіміляцыйнага паходжання ад зліцця прышлых плямёнаў з балтамі. Тым не менш аўтарытэтныя навукоўцы сцвярджаюць: «...племена радимичей, дреговичей и кривичей положили начало белорусской национальности» [2, с. 22].

У самым цэнтры крывіцкай зямлі Л. Нідэрле размяшчае горад Таропец, які зараз адносіцца да Цвярской вобласці Расіі. Іншы даследчык піша, што на чале зямлі «...стоял город Кривитеск, потом называвшийся Торопец» [3, с. 3].

Тым цікавей было наведаць гэты горад, вывучыць яго культуру і перш за ўсё архітэктуру, бо камяні, як казаў вялікі М.В. Гогаль, гавораць і тады, калі маўчаць і песні, і паданні.

У сацыяльна-палітычнай і культурнай эвалюцыі краін і народаў вялікую ролю іграюць **камунікацыйныя магчымасці**, асаблівасці і наяўнасці шляхоў зносін, што дазваляюць наладзіць з іншымі народамі ўстойлівыя сувязі.

Камунікацыйнай воссю, якая ў большай ступені паўплывала на гістарычны лёс рускага, беларускага і ўкраінскага народаў, быў шлях «з варагаў у грэкі». Гэты старажытны маршрут звязваў Балтыйскі і Чарнаморскі басейны і праходзіў праз зямлю крывічоў. Вось што піша, напрыклад, С.М. Салаўёў: «Верхняя Двина и впадающая в нее речка Торопа служили соединением Новгородской области с собственною Русью, областью Днепровскою, по ним шел путь из варяг в греки» [4, с. 63].

Таропецкая зямля ў розныя часы адносілася да Віцебска-Полацкай, Смаленскай, Пскоўскай, Цвярской земляў. Яна заўсёды знаходзілася на скрыжаванні шляхоў, этнасаў і культур. Гэта яе «парубежнае» становішча актыўна паўплывала на культурнае і архітэктурнае развіццё краю.

Пачатковы перыяд фарміравання тут устойлівых паселішчаў характэрны для шмат якіх славянскіх народаў. Першасная горадабудаўнічая дзейнасць – гэта ўзвядзенне земляных гарадзішчаў з драўлянымі або часткова напаўзаглыбленымі пабудовамі ўнутры.



2. Казанская царква. XVII ст.



3. Нікольская царква. XVII ст.

Такія калыскі-гарадзішчы, як і ў іншых рускіх і беларускіх гарадах, часта размяшчаліся на берагах водных басейнаў. Існуючая рака ці возера забяспечвалі абарону ад ворагаў. Гарадзішча старажытнага Таропца месцілася на зліцці ракі Таропы з возерам Саломена.

Наступны гістарычны перыяд адносіцца ўжо да пачаткаў дзяржаўнасці, калі сфарміравалася княжацкая ўлада. Тады тут з'явіліся крапасныя пабудовы ў выглядзе драўляных астрогаў – агароджы з вежамі, а таксама адбудаваліся жылыя паселішчы вакол – пасады.

З X да XVII ст. існавала, па большасці, драўлянае будаўніцтва, тыповае для ўсходніх славян. Лес быў асноўнай крыніцай будаўнічых матэрыялаў, выкарыстоўваліся пераважна зрубныя канструкцыі. Чацвярык, васьмярык (круглік) ужываліся ў жыллёвых, абарончых і нават храмавых пабудовах. Асаблівасцю (трагічнай) славянскай драўлянай архітэктуры было тое, што большасць такіх пабудоў з часам знікала і вывучыць яе старажытную гісторыю магчыма толькі па рэштках археалагічных знаходак ці па пазнейшых аналагах, бо прыёмы драўлянага дойлідства вельмі кансерватыўныя.

Цікавай, хоць і дакладна невядомай вяхой у развіцці драўлянага будаўніцтва застаецца час прыходу ў яго архітэктурна-дэкаратыўных прыёмаў. Хутчэй за ўсё ён быў звязаны як з ростам агульнай культуры (у тым ліку эстэтычнай), так і развіццём іншых галін дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва: ткацтвам, ганчарствам, пляценнем. Але факт застаецца фактам – арнаментальна-дэкаратыўныя прыёмы прыходзяць у драўлянае дойлідства і ўзнікаюць на сценах дамоў, на ліштве, аздабляюць дахі і г.д.

Каменная архітэктура прыйшла сюды ў XVI–XVII стст. Да нашага часу захаваўся (на жаль, мноства помнікаў было знішчана ў жорсткім XX ст.) шэраг цудоўных храмаў XVII ст. Сярод іх – Нікольская, Казанская, Спаса-Праабражэнская цэрквы (мал. 2–4). Цікава, што пры ўстойлівай агульнай кампазіцыі з галоўным кубавідным аб'ёмам – чацверыком – розны падыход ажыццёўлены ў вертыкальным напрамку. У Нікольскай царкве на чацвярык пастаўлены васьмярык, у Казанскай і Спаса-Праабражэнскай дах над чацверыком вянчае васьмярычны барабан. Асноўныя аб'ёмы цэркваў аздобленыя дэкорам – пяясамі з парэбрыкаў, шырынак і аркатурамі з плоскіх (бяздахавых) какошнікаў. Аб ужыванні тут некаторых прыёмаў драўлянага дойлідства і дэкаратыўнага мастацтва піша даследчык: «В архитектуру каменных построек этой эпохи были перенесены не только навыки деревянного строительства, но и приемы узорчатой резьбы по дереву» [5, с. 16].



4. Спаса-Праабражэнская царква. XVII ст.

Цудоўным дэкаратыўным прыёмам таропецкай храмавай архітэктуры было ўжыванне керамічных кафляў на фасадах цэркваў. Магчыма, гэта якраз сведчанне аб глыбокіх сувязях з іншымі часткамі беларускіх зямель (мал. 5, 6). Пра гэта ўпамінае вядомы беларускі вучоны Л.С. Абецадарскі, калі піша, што менавіта беларускія



6. Кафля Казанскай царквы



5. Дэталь фасада Нікольскай царквы



7. Вуглавы фрагмент фасадаў Казанскай царквы



8. Вуглавы фрагмент фасадаў Спаса-Праабражэнскай царквы

9. Дах царквы Іаана Прадцечы. XVII – пач. XVIII ст.



майстры (цанінніки) «внедрили не применявшуюся раньше в России технику изготовления многоцветных рельефных эмалевых изразцов» [6, с. 227].

Архітэктура Таропца XVII–XVIII стст. дае нам магчымасць убачыць і адчуць, як ідэі рэнесансу і барока прыйшлі на нашы землі. Менавіта ідэя трохмернасці (3D) рэнесансу закладзена ў вырашэнне верхніх дэкаратыўных паяскоў Казанскай і Спаса-Праабражэнскай цэркваў. Калі ў Казанскай царкве аркатурны дэкор з какошнікаў размешчаны асобна на кожным фасадзе, што сведчыць аб мастацкай незалежнасці кожнага з іх, то ўжо ў Спаса-Праабражэнскай апошні ўзор какошніка падзяляецца і пераходзіць на бакавы фасад. Гэты прыём падкрэслівае аб'ёмнасць пабудовы (мал. 7, 8).

Яшчэ больш новы, «эксперыментатарскі» дух адчуваеш у вырашэнні дахаў, калі бачыш, як у прысадзістай царквы Іаана Прадцечы выразна выгінаецца пакрыццё чацверыка (мал. 9). Гэта быццам пачатак эвалюцыі да наступных дахаў главак цэркваў з іх грушападобнымі купаламі, што мы назіраем і на іншых землях пагранічча (Смаленскай, Чарнігаўскай і г.д.).

Прыкладам асаблівай, глыбокавыразнай інтэрпрэтацыі ідэі барока з'яўляецца царква Раства Хрыстова XVIII ст. Менавіта ў ёй кампазіцыя рознай велічыні аб'ёмаў прымае свабодную і складаную форму, што дазваляе нам казаць пра нараджэнне новага стылю, дзе ўстойлівыя асаблівасці праваслаўнай архітэктуры зліваюцца з павольнасцю барока. Аб гэтым сведчаць і формы дахаў, купалоў, і аздабленне фасадаў гэтага цудоўнага твора мастацтва (мал. 10).

Апафеоз таропецкага дойлідства – Корсунска-Багародзіцкі сабор і Пакроўская царква (мал. 11, 12). Абодва творы з'яўляюцца прыкладам таго, як у нашых мясцовасцях інтэрпрэтаваліся ідэі барока. У гэтых храмах майстры ўжо працуюць у поўную сілу, адчуваючы адначасова і сваю «рускасць», і «еўрапейскасць». Трэба адзначыць, што разуменне асаблівасці розных нацыянальных інтэрпрэтацый барока вядома здаўна: гэта і «італьянскае» барока, і «нямецкае», і «віленскае», і «рускае», і «нарышкінскае»... Вось цудоўны Траецкі храм XVIII–XIX стст. у Хварасцеве ля Таропца з узрушальным авальным купалам, які лунае над асноўным аб'ёмам царквы (мал. 13).



10. Царква Раства Хрыстова. 1762 г.



11. Корсуньска-Багародзіцкі сабор. XVIII ст.



13. Купал Траецкай царквы ў Хваросцеве

Таропецкія храмы і жылыя пабудовы наогул даюць прыклады зліцця прыёмаў ўсходнеславянскіх і заходнееўрапейскіх культур. Падставай гэтаму і гісторыя, бо Таропец у XIV–XV стст. уваходзіў у склад ВКЛ, затым – парубежны горад, вядомы як гандлёвы вузел, які звязваў Масковію з Рэччу Паспалітай.



12. Пакроўская царква. XVIII ст.

Цікава, што калі раней мы гаварылі пра ўплыў драўлянага дойлідства на каменнае, то з росквітам высокапрафесійнага мастацтва храмавай архітэктуры адбываецца адваротны працэс.

Драўляныя дамы з канца XVIII ст. пачынаюць успрымаць архітэктурныя прыёмы каменнага будаўніцтва. На жылых дамах ужо з XIX ст. з'яўляюцца такія рысы, як падкрэсленыя цокалі, пілястры, строгая трохкутная ліштва (мал. 14). І нават у такім прыёме, як аздабленне вугла дома рознымі пілястрамі, адчуваеш класічны прынцып, калі ўзорысты верх пілястры прымае выгляд капітэлі (мал. 15).

Так нараджалася тое, што некаторыя даследчыкі называюць «таропецкай архітэктурнай школай» [5, с. 63]. Так на гэтай зямлі беларускага пагранічча нараджалася сапраўднае зліццё, творчы дыялог розных культур.



14. Фрагмент фасада драўлянага дома



15. Дэталь дэкору драўлянага дома


**Літаратура**

1. Нидерле, Любор. Славянские древности (пер. с чеш.). – М.: Культурный центр «Новый Акрополь», 2010.
2. Довнар-Запольский, М.В. История Белоруссии. – Мн.: Беларусь, 2003.
3. Побойнин, И. Торопецкая старина. Исторические очерки города Торопца с древнейших времен до конца XVII века. – М.: Изд. импер. общ. ист. и древн. Российских, 1902.
4. Соловьев, С.М. История России с древнейших времен. Соч. в 18 кн. Кн. 1. Т. 1–2. – М.: Мысль, 1988.
5. Косточкин, В.В. Архитектурные памятники Торопца // Памятники культуры. Исследования и реставрация. Вып. 1. – М.: Изд. АН СССР, 1959.
6. Абецедарский, Л.С. Белоруссия и Россия. Очерки русско-белорусских связей второй половины XVI–XVII вв. – Мн.: Выш. школа, 1978